МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

7 верасня 2018 г. № 36 (469)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

«ЗЯЛЁНЫЯ» НАСТУПАЮЦЬ

Інвазійныя расліны наносяць шкоду прыродзе, здароўю людзей і эканоміцы краіны. Якім чынам можна гэтаму супрацьстаяць?

Папаўненне беларускай флоры новымі раслінамі, мэтанакіравана ці выпадкова прывезенымі з іншых краін, на жаль, не заўсёды праходзіць бяскрыўдна. Некаторыя з «чужаземцаў» выходзяць з-пад кантролю і пачынаюць захопліваць усё большыя тэрыторыі. Спецыялісты называюць такія расліны інвазійнымі.

ПРАЦЯГ ТЭМЫ — на 4–16-й стар.

ІНІЦЫЯТЫВА

Альтанкі для сталых, горкі для юных

Гамяльчанам прапануюць добраўпарадкоўваць двары на долевых умовах

САМЫМІ прывабнымі дварамі становяцца тыя, дзе парадак наводзілі самі жыхары. Гэтую думку да тых, хто жыве на вуліцы Мінскай, паспрабавалі данесці кіраўніцтва і спецыялісты КЖРЭУП «Савецкае». Для чаго і правялі сустрэчу з людзьмі.

Дырэктар камунальнага прадпрыемства, дэпутат гарадскога Савета Міхаіл ПРУС прапанаваў жыхарам фінансава паўдзельнічаць у добраўпарадкаванні тэрыторыі. За сабраныя сродкі можна ўсталяваць гульневае абсталяванне, лаўкі, іншыя малыя формы.

Мяркуецца, што са свайго боку КЖРЭУП спланує тэрыторыю, выдзеліць тэхніку і працоўныя рукі. На жаль, на большае разлічваць не даводзіцца, бо грошы на гэтыя мэты цяпер не выдаткоўваюцца. Некалькі гадоў таму з тэхнічнага абслугоўвання жыллёвага фонду выключылі работы па добраўпарадкаванні тэрыторый каля дамоў. Прапанавалі шукаць спонсараў, каб за іх кошт абсталёўваць прыгожыя дзіцячыя пляцоўкі.

І такія выпадкі здараюцца. Напрыклад, зусім нядаўна ў Рэчыцы грамадзянін падараваў двару дзіцячы спарткомплекс, які каштуе прыкладна паўтары тысячы рублёў. Пры гэтым вырашыў застацца невядомым для грамадскасці.

Індывідуальны прадпрымальнік з уласнай ініцыятывы ўстанавіў у мікрараёне Наварэчыцкі вулічны спартыўны комплекс беларускай вытворчасці з усімі неабходнымі для падобных збудаванняў сертыфікатамі. Ён кампактны, выкананы з металу, абсталяваны турнікамі, лесвіцамі, рукаходам і іншымі элементамі. Пры гэтым супрацоўнікі мясцовага ЖЭУ ўзгаднялі месца ўстаноўкі і дапамагалі з мантажом.

Дырэктар камунальнага прадпрыемства «Савецкае», дэпутат гарадскога Савета Міхаіл ПРУС на сустрэчы з жыхарамі.

Аднак падобныя ініцыятывы пакуль рэдкасць, і таму камунальнікі Савецкага раёна ідуць па іншым шляху.

стар. 16

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

Рабочая група ў дзеянні

Бурныя дыскусіі і спрэчкі вакол праекта змяненняў у закон. стар. 2

Да форуму рэгіёнаў

У Магілёве гарачая пара: працягваецца падрыхтоўка аб'ектаў. стар. 3

Нельга чакаць

Нават невялікае прамаруджванне дасць «агрэсару» шанц. стар. 13

На свае вочы



Палацава-паркаваму комплексу пагражае... нашэсце сумніку. стар. 15

Адпачнулі на бульбафэсце

Дбайных людзей славілі ды весела час бавілі. стар. 16